**УДК 947.608.42(043)**

# ЗАХОДНЯЯ ВОБЛАСЦЬ ЯК АДЗІНКА Ў АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ПАЛІТЫЧНАЙ СІСТЭМЕ РСФСР

***З.А. КУНІЦКАЯ***
***(Беларускі дзяржаўны універсітэт)***

*На падставе шырокага кола гістарычных крыніц зроблена спроба вызначэння юрыдычнага і фактычнага статусу Заходняй вобласці.*

Стварэнне ў лістападзе 1917 года Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронта (Аблвыкамзах) як адзінага кіруючага цэнтра для беларускіх губерняў і заходняга ўчастка лініі фронту мела важнае значэнне на шляху да нацыянальнага самавызначэння беларускага народа. Тэрыторыя гэтага ваенна-цывільнага ўтварэння, за выключэннем акупіраваных германскімі войскамі беларускіх зямель, якія несумненна бачыліся ў перспектыве вобласцю, у асноўным супадала з этнічнымі межамі беларусаў. Вылучэнне іх у асобны адміністрацыйна-палітычны арганізм азначала тым самым фармальнае прызнанне, няхай і ў такім сціплым варыянце, іх адзінства з боку афіцыйных улад і было крокам наперад у параўнанні з папярэднім перыядам. Пры гэтым вызначэнне юрыдычнага і фактычнага статусу Заходняй вобласці мае прынцыповае значэнне.

У айчыннай гістарыяграфіі ён выклікае рознагалоссе. Калі юрыдычны статус абласных аб’яднанняў некалькі недакладна акрэслены нарматыўнымі актамі таго часу, то фактычны выклікае яшчэ большую блытаніну. З прычыны таго, што Заходняя вобласць стала эканамічнай і палітычнай базай для стварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, многія даследчыкі, улічваючы шырокія паўнамоцтвы мясцовых органаў улады ў першыя месяцы пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, схільны прыпісваць гэтаму ўтварэнню нацыянальна-аўтанамісцкі статус, хаця ніякіх прававых актаў, якія замацоўвалі б адпаведнае становішча Заходняй вобласці, не знойдзена.

Сутнасць гэтай пазіцыі, якой прытрымліваліся многія савецкія гісторыкі, заключаецца ў наступным: Заходняя вобласць адрознівалася ад іншых тэрытарыяльных адзінак РСФСР нацыянальным складам насельніцтва і нацыянальна-тэрытарыяльным прынцыпам яе арганізацыі, з’яўлялася па свайму фактычнаму статусу нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміяй. Гэтыя погляды ўтрымліваюцца ў працах Н.В. Каменскай [1, с. 30], Е.І. Бугаёва [2, с. 221], С.П. Маргунскага і Л.І. Кукраша [3, с. 38]. Да гэтай групы даследчыкаў можна аднесці М.І. Кулічэнка [4, с. 64] і Т.С. Гарбунова [5, с. 44], якія называлі Аблвыкамзах органам улады беларускага народа. У гістарычнай літаратуры выказана і другая думка (А.І. Чысцякоў [6, с. 44], В.А. Круталевіч [7, с. 48], С.М. Хоміч [8, с. 20]): Заходняя вобласць, нягледзячы на тое, што аб’ядноўвала ў сваіх межах беларускія землі і мела характар нацыянальнага раёна, тым не менш з’яўлялася звычайнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай.

Нельга не прызнаць, што і той і іншы бакі маюць некаторыя падставы для сваіх сцвярджэнняў. Нарматыўныя і прававыя дакументы таго часу, часта недакладныя, супярэчлівыя, даюць прастор для разважанняў і здагадак і нярэдка могуць служыць абгрунтаваннем супрацьлеглых пазіцый. Тым не менш устанаўленне ісціны ўяўляецца магчымым і неабходным.

**Галоўнай задачай** дадзенага артыкула з’яўляецца вызначэнне статусу Заходняй вобласці як адміністрацыйнай адзінкі ў складзе Расійскай Федэрацыі, што немагчыма без аналізу канкрэтных гістарычных абставін, юрыдычных норм таго часу.

Савецкія гісторыкі пры вызначэнні статусу Заходняй вобласці аперыравалі такім паняццем, як «нацыянальна-аўтаномны», які, каб унесці большую яснасць у пытанне, неабходна падзяліць, бо яго складальныя часткі не ўзаемазвязаны. Аўтаномія – гэта права на самастойнае здзяйсненне дзяржаўнай улады альбо ўпраўлення, якое прадастаўлена канстытуцыяй якой-небудзь часткі дзяржавы [9, с. 17]. Аўтаномія можа мець уласныя законы, як і адміністрацыйны механізм, якія, аднак, не павінны супрацьстаяць агульнадзяржаўным законам [10, с. 84].

У дакументах Заходняй вобласці не ўзгадваецца аб яе аўтаномным статусе, няма і асобных прававых актаў, якія б надзялялі ім вобласць. Але зыходзячы з досыць самастойнай дзейнасці Аблвыкамзаха некаторыя з савецкіх даследчыкаў настойвалі на фактычнай, а не юрыдычнай аўтаноміі. У якасці праявы аўтаномнасці Заходняй вобласці С.П. Маргунскі і Л.І. Кукраш у сумеснай працы «Интернациональное и национальное в государственном строительстве БССР», якая ўдзяляе значную ўвагу праблемам індэнтыфікацыі Заходняй вобласці, разглядаюць менавіта тое, што ў сваёй практычнай дзейнасці Аблвыкамзах вырашаў амаль усе пытанні прававога рэгулявання ў галіне народнай асветы і культуры, аховы здароўя,

гандлю, грамадскага парадка і бяспекі, збору падаткаў і інш. Аблвыкамзах наладзіў сувязь і інструктаванне створаных на тэрыторыі вобласці Саветаў. Газета «Советская правда» – орган абласнога выканаўчага камітэта – надрукавала схему канструявання мясцовых органаў улады і растлумачыла прынцыпы пабудовы органаў улады вобласці. Парадак выбараў і кампетэнцыя дзейнасці сельскіх і валасных Саветаў рэгламентаваліся спецыяльнай інструкцыяй. Да праяў аўтаномнасці Маргунскі і Кукраш адносяць устанаўленне кантролю над банкамі, дэмабілізацыю арміі і ліквідацыю звязаных з ёю ўстаноў, самастойную распрацоўку дэкрэтаў аб падатковых абкладаннях і інш. [3, с. 41 – 42].

Нельга не пагадзіцца, што дадзеныя дзеянні, з нашай сённяшняй пазіцыі, выходзяць за межы кампетэнцыі органаў мясцовай улады, што наяўнасць падобных функцый у апошніх можа сведчыць аб іх аўтаномнасці. Але першапачаткова пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі яшчэ незастылыя формы ўлады пры неаднароднасці апарата, пры слабых сувязях паміж рознымі звёнамі давалі прастор для дзейнасці і самых шырокіх паўнамоцтваў мясцовых органаў; цэнтр вымушаны быў згадзіцца з перадачай часткі сваіх функцый месцам. Зваротам ІІ Усерасійскага з'езда Саветаў «Аб паўнаце ўлады Саветаў» устанаўлівалася ўсеўладдзе Саветаў [11, арт. 5]. Інструкцыя Савета Народных Камісараў (Саўнаркам, СНК), надрукаваная 23 лістапада 1917 года па пытаннях «Аб субсідзіраванні мясцовых Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў» звяртала ўвагу мясцовых Саветаў на тое, што яны, з'яўляючыся ўладай на месцах, валодаюць і падатковымі правамі [11, арт. 47].

У інструктыўным лісце Народнага Камісарыята ўнутраных спраў (НКУС) «Да ўсіх Саветаў рабочых, салдацкіх, сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў» ад 22 снежня 1917 года Абласныя Саветы разглядаліся як найбольш буйныя адзінкі, за якімі ішлі другія, дробныя, – губернскія, павятовыя і валасныя. У дадзенай інструкцыі абласныя аб'яднанні не атрымлівалі ніякіх асаблівых правоў, якасна вылучаўшых іх з агульнай сістэмы мясцовых Саветаў [12, с. 162]. Такія правы абласным аб'яднанням надаваліся рашэннямі ІІІ Усерасійскага з'езда Саветаў (10 – 18 студзеня 1918 г.). 15 студзеня 1918 года ім была прынята Рэзалюцыя «Аб федэральных установах Расійскай Рэспублікі». Рэзалюцыя падзяляла будучых суб'ектаў федэрацыі на 3 катэгорыі: савецкія рэспублікі, асобныя вобласці і вобласці, якія адрозніваюцца асаблівым побытам і нацыянальным складам. У пункце 5 рэзалюцыі гаварылася, што спосаб удзелу азначаных суб'ектаў федэрацыі ў федэральным урадзе, размежаванне сфер дзейнасці федэральных і абласных устаноў Расійскай Рэспублікі, вызначаюцца неадкладна, пасля ўтварэння абласных савецкіх рэспублік [13, с. 105 – 106].

Два наступных пункты рэзалюцыі (6 і 7) – прапановы фракцыі левых эсэраў – утрымлівалі вызначэнне кампетэнцыі будучых федэратыўных частак: на цэнтральную ўладу ўскладалася правядзенне мерапрыемстваў толькі ў агульнадзяржаўным маштабе, пры гэтым не павінны былі парушацца правы асобных, уступіўшых у федэрацыю абласцей [13, с. 105 – 106].

Гэта была ўступка левым эсэрам, якія стаялі за шырокія правы мясцовых Саветаў. Многія бальшавікі, у тым ліку У.І. Ленін і І.В. Сталін, дамагаліся ўсталявання моцнай цэнтральнай улады. Але яны ўсё ж такі вымушаны былі пайсці ў гэтым важным моманце насустрач левым эсэрам, бо тыя падтрымалі разгон Устаноўчага схода, што і легітымізаваў ІІІ Усерасійскі з'езд Саветаў. У далейшым, спасылаючыся на яго рашэнні, левыя эсэры адстойвалі шырокія правы «абласных савецкіх рэспублік».

20 студзеня на падставе рашэнняў з'езда НКУС распрацаваў інструкцыю, у якой зноў указвалася, што «губерні, звязаные нацыянальнымі, геаграфічнымі або эканамічнымі сувязямі, аб'ядноўваюцца ў вобласці. На чале вобласці стаіць абласны Савет і выканаўчы камітэт». Далей гаварылася, што ўсе вобласці былой расійскай тэрыторыі, якія прызнаюць Савецкую ўладу, складаюць Расійскую Сацыялістычную Федэратыўную Рэспубліку Саветаў [12, с. 166].

Як лічыць даследчыца З.Л. Серабракова, палажэнні рэзалюцыі «Аб федэральных установах Расійскай Рэспублікі» надавалі абласным аб'яднанням Саветаў правы органаў дзяржаўнай улады, а інструкцыя разглядала нацыянальную, геаграфічную эканамічную агульнасць роўнымі падставамі для стварэння ўваходжання вобласці ў склад РСФСР на пачатках федэрацыі [14, с. 162 – 163].

Такім чынам, рэзалюцыя ІІІ Усерасійскага з'езда Саветаў надзяляла аўтаноміяй будучыя федэратыўныя часткі Расійскай Рэспублікі: савецкія рэспублікі, асобныя вобласці і вобласці, якія адрозніваюцца асаблівым побытам і нацыянальным складам, без вызначэння прэрагатывы нацыянальнага фактара, а інструкцыя НКУС ад 20 студзеня, аб'яўляючы іх часткамі Расійскай Федэрацыі, распаўсюджвала гэта права на ўжо існуючыя вобласці.

Выходзячы з гэтага, можна казаць пра аўтаномныя правы Заходняй вобласці, бо ўскосна яны былі прызнаны, хаця і без адпаведных юрыдычных актаў, цэнтральнай уладай. Але перабольшваць гэты факт не варта.

Неўзабаве, ужо маскоўскі, ўрад узяў накірунак на цэнтралізацыю краіны. Пачынаецца Кампанія барацьбы з «сепаратызмам, местніцтвам і абласніцтвам». Каб умацаваць цэнтральную ўладу неабходна

было скараціць колькасць суб'ектаў федэрацыі, і зразумела, за кошт абласцей, аб'яднаных эканамічным або геаграфічным фактарамі, бо пазбаўленне нацыянальных рэгіёнаў права на ўваход у склад РСФСР на пачатках федэрацыі было б поўна небяспечных вынікаў. Пачаткам гэтай Кампаніі можна лічыць намаганні па ліквідацыі абласных і губернскіх Саўнаркамаў – якія ў вачах бальшавікоў былі сімваламі дэцэнтралізацыі.

У дакладзе на VII з'ездзе партыі (сакавік 1918 г.) Я.М. Свярдлоў – старшыня УЦВК, спыніўшыся на пытаннях аб будаўніцтве савецкіх арганізацый, указаў, што слова «камісар» павінна быць устаранёна [15, с. 160]. Канстытуцыя 1918 года ўжо абавязвала перабудаваць абласныя Саветы па тыпу мясцовых, а не па прыкладу цэнтральнай улады. Выканаўчыя камітэты павінны былі мець адпаведныя аддзелы на чале з загадчыкам, а не Саўнаркамы і камісарыяты з народнымі камісарамі. У Канстытуцыі гаварылася, што званне «народны камісар» належыць выключна членам СНК, якія распараджаюцца агульнымі справамі краіны [13, с. 150].

Вобласці з незадавальненнем успрынялі наступ на свае правы, кіраўніцтва многіх з якіх уяўляла сябе сапраўдным урадам. Так, маскоўскі Саўнаркам выступіў супраць шэрага мерапрыемстваў цэнтральных камісарыятаў, прыняў рашэнне аб дэнацыяналізацыі аднаго з маскоўскіх банкаў, пастанавіў аб выпуску сваіх грошаў і г.д. Уральская абласная партыйная канферэнцыя патрабавала прыняцця рашэння аб аддзяленні Уральскай вобласці ад цэнтра, а II з'езд Саветаў Сібіры паставіў перад Саўнаркамам рэспублікі пытанне аб самастойнасці знешняй палітыкі Сібіры [16, с. 124]. Але Заходняя вобласць была не ў тым становішчы, каб скарыстацца прадастаўленай аўтаноміяй. Наступленне нямецкіх войскаў і далейшая акупацыя большай часткі паставілі пад пагрозу само яе існаванне. Пасля пашырэння вобласці за кошт Смаленскай губерні, вясной 1918 года, Аблвыкамзах запэўніваў цэнтральныя ўлады такім чынам: «у аднаўленні вобласці цэнтр заўважаў з боку яе, быццам бы, тэндэнцыю на поўную аўтаномію. Гэту небяспеку дэцэнтралізацыі абласны Савет добра зразумеў, і, жадаючы яе ліквідаваць, з'езд ... пастанавіў, што Аблвыкамзах кіруецца ў сваёй дзейнасці ўказаннямі і распараджэннямі цэнтральнай савецкай улады» [17, ф. 35, воп. 1, спр. 44, л. 50]. Згодна прадпісанням Свярдлова, II з'езд Саветаў Заходняй вобласці (10 – 14 красавіка 1918 г.) ліквідаваў у структуры Аблвыкамзаха такія звёны, як Саўнаркам і камісарыяты [18, ф. 161, воп. 1, спр. 29, л. 8].

Вясной 1918 года ў краіне разгарнулася дыскусія па пытанню: які прынцып будзе праведзены пры пабудове Расійскай Федэрацыі, тэрытарыяльны ці нацыянальны. За тэрытарыяльны выступалі многія прававеды, левыя эсэры і нават некаторыя бальшавікі [12, с. 170]. Нацыянальны адстойвалі У.І. Ленін, І.В. Сталін. «Відавочна, – гаварыў Сталін, – суб'ектамі федэрацыі павінны быць і могуць быць не ўсялякія ўчасткі і адзінкі і не ўсялякая геаграфічная тэрыторыя, а толькі пэўныя вобласці, якія натуральна спалучаюць у сябе асаблівасці побыту, нацыянальнага складу і некаторую мінімальную цэласнасць эканамічнай тэрыторыі» [19, с. 69]. У.І. Ленін у сваёй працы «Чарговыя задачы Савецкай улады» сцвярджаў, што дэмакратычны цэнтралізм не выключае аўтаномію, але, наадварот, мяркуе яе ў тым выпадку, калі яна заснавана на нацыянальных адрозненнях. Правы аўтаноміі меркавалася пакінуць толькі нацыянальным рэгіёнам [20, с. 151].

Каб захаваць права на аўтаномію Паўночна-Заходні абласны камітэт РКП(б) робіць акцэнт на «этнічнае і этнаграфічнае» адзінства Заходняй вобласці, якая яшчэ ў першым варыянце аб'яднала «аднародныя па свайму геаграфічнаму і этнаграфічнаму складу тэрыторыі, аб'яднаныя паміж сабой яшчэ пабытовымі і нацыянальнымі прыкметамі» [17, ф. 59, воп. 1, спр. 18, л. 8].

Наступленне германскіх войскаў некалькі «скранула» межы вобласці на ўсход, але Аблвыкамзах па-ранейшаму лічыць яе этнаграфічна адзінкай. У пастанове аб зацвярджэнні Заходняй камуны (верасень 1918 г.) зноў-такі адшукваецца, ужо пры некалькі іншых межах – Смаленская, Віцебская, Магілёўская, Мінская і часткі Віленскай, Ковенскай, Гродненскай губерняў – яе этнаграфічнае адзінства «...паколькі ў вышэйпералічаных губернях асела 15-мільённая маса беларускіх і літоўскіх сялян» [17, ф. 35, воп. 1, спр. 44, л. 127].

Тут можна пазначыць, што для Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б) словы «этнаграфічныя і нацыянальныя асаблівасці» былі пустым гукам. Так, В. Кнорын, нязменны сакратар абласнога партыйнага камітэта, у артыкуле «Самавызначэнне народаў і дыктатура пралетарыята» лозунг «самавызначэння ўсіх народаў» называе няўдачным. «З усталяваннем рабоча-сялянскай улады нацыянальнае пытанне губляе сваё значэнне, і нацыянальнасць з'яўляецца толькі другараднай прыкметай, якая не мае рашаючага значэння» [17, ф. 59, воп. 1, спр. 56, л. 3].

Тым не менш выкарыстаць гэту «другарадную прыкмету» ў сваіх інтарэсах абласны камітэт не грэбаваў. У яго планах было пераўтварэнне Заходняй вобласці ў сапраўдны суб'ект федэрацыі: цэнтралізваны, самастойны, з істотнымі адрозненнямі ад сістэмы ўладкавання астатніх рэгіёнаў. Канстытуцыя

РСФСР, якая была прынята ў пачатку ліпеня 1918 года і якая замацоўвала федэрацыю як спосаб уладкавання Расійскай Рэспублікі, давала падставы для іх намаганняў.

Хаця Канстытуцыя 1918 года прадастаўляла абласным аб'яднанням дакладна акрэсленыя правы, у іх былі толькі тэрытарыяльна больш шырокія сферы дзейнасці, якія якасна не адрозніваліся ад кампетэнцыі іншых аб'яднанняў Саветаў. Але артыкул 11 Канстытуцыі ўстанаўліваў, што вобласці, якія адрозніваюцца асаблівым побытам і нацыянальным складам, могуць аб'ядноўвацца ў аўтаномныя абласныя саюзы на чале са сваімі органамі савецкай улады. Гэтыя вобласці маглі ўваходзіць у рэспубліку на пачатках федэрацыі [13, с. 157].

Рэалізацыю сваіх планаў Аблвыкамзах пачаў са спробы ліквідацыі губернскіх цэнтраў у вобласці. 20 ліпеня на пасяджэнні Паўночна-Заходняга абласнога камітэта была прынята пастанова аб неабходнасці скасавання Віцебскага і Магілёўскага Саўдэпаў, і аб'яднання пры гэтым усіх губерняў у адзінку, якая б кіравалася Абласным выканкамам [17, ф. 60, воп. 3, спр. 368, л. 1]. Аблвыкамзахам быў распрацаваны праект Канстытуцыі Заходняй камуны. Ён захоўваецца ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Поўная назва – «Праект Канстытуцыі Заходняй Камуны і арганізацыі апарата ўлады»; надрукаваны тыпаграфскім шрыфтам у выглядзе калонкі з газеты. У верхнім правым куце праекта Канстытуцыі паведамлялася, что рэдакцыя «прапануе выказацца па гэтаму пытанню ў вашай газеце» [17, ф. 59, воп. 1, спр. 18, л. 51].

Дата напісання не вядома, але яе магчыма аднавіць. Так як у склад Заходняй камуны павінны былі ўваходзіць чатыры губерні (Віцебская, Магілёўская, Мінская, Смаленская), значыць праект складаўся яшчэ да вызвалення акупіраваных немцамі тэрыторый. Мяркуючы па назве – Заходняя камуна (менавіта так планавалася назваць вобласць летам 1918 года), можна сказаць, што праект быў складзены менавіта тады.

Згодна праекта Канстытуцыі Заходняй Камуны, вышэйшая ўлада ў ёй належала камунальным з'ездам Саветаў. У прамежку паміж імі камунай кіраваў СНК Заходняй Камуны, які аб'ядноўваў у сваіх руках заканадаўчую і выканаўчую ўлады. Ён быў адказны і падсправаздачны цэнтральным савецкім органам. Пры гэтым не прадугледжвалася вылучэнне з'ездам ніякіх іншых органаў. Замест традыцыйнага выканаўчага камітэта для сувязі і падсправаздачнасці перад з'ездам Саветаў пры СНК Заходняй Камуны ствараўся Выканаўчы камунальны камісарыят. Усе справы, грашовыя сумы, справаздачнасць і г.д. перадаваліся Савету народнай гаспадаркі Заходняй Камуны. Моцную цэнтральную ўладу забяспечвала скасаванне губвыканкамаў. Пункт № 3 праекта скасоўваў губернскія цэнтры, частка работнікаў расфарміраваных органаў пераходзіла на працу ў гарадскія Саветы, а частка адпраўлялася працаваць на «месцы» – у павятовыя і валасныя Саветы. Пры кожным камісарыяце прадугледжваўся іншагародні аддзел (не менш 3 чалавек), які павінен быў інструктаваць у межах свайго камісарыята мясцовыя Саветы і падтрымліваць з імі сувязь [17, ф. 59, воп. 1, спр. 18, л. 51]. Аб лёсе гэтага праекта мала што вядома. Звестак аб тым, што ён быў зацверджаны органамі ўлады Заходняй камуны ў архівах і перыядычным друку таго часу знайсці не ўдалося [3, с. 57]. Можна меркаваць, што характар праекта быў расцэнены як сепаратысцкі або незалежніцкі, і ён не быў адобраны Масквой. Па-першае, у праекце Канстытуцыі Заходняй камуны незадавальненне цэнтра магла выклікаць сама назва ўрада, якая капіраваннем цэнтральнага апарата сведчыла аб прэтэнзіях на празмерна шырокія паўнамоцтвы. Па-другое, па савецкай традыцыі, што ўжо склалася на той момант, Савет Народных Камісараў (і цэнтральны, і абласныя, пакуль яны яшчэ існавалі) пры здзяйсненні функцый выканаўчага і распарадчага органа, быў падсправаздачны выканкаму [21, с. 113]. А тут структурная схема, якая ўсталявалася, была парушана. Прычынай ліквідацыі такога важнага звяна савецкай улады, як выканаўчы камітэт, магла стаць незадавальняючая праца Аблвыкамзаха, у выніку якой прынцыповыя пытанні вырашаліся толькі ў абласным камітэце партыі [17, ф. 59, воп. 1, спр. 11, л. 128]. Усё гэта разам з гаспадарча-эканамічнай самастойнасцю, моцнай цэнтральнай уладай і наяўнасцю ўласнай Канстытуцыі гаворыць аб прэтэнзіях бальшавіцкай вярхушкі на аўтаномны статус Заходняй вобласці і дэ-юрэ, і дэ-факта.

Умацаванне сваёй улады Аблвыкамзах бачыў у барацьбе за партыйную дысцыпліну і ліквідацыю на сваім, мясцовым узроўні сепаратызма з боку ніжэйстаячых органаў. «Для паспяховай гаспадарчай работы няма месца ніякаму сепаратызму, павінна быць беспярэчнае падначаленне цэнтральнай уладзе», «ва ўнутранай палітыцы мы карэнным чынам не маглі пагадзіцца з той дэцэнтралізацыяй, якая панавала яшчэ нядаўна, калі было, што ні горад – свая камуна, якая праводзіла свае дэкрэты. Гэтымі зваротамі да Цэнтральнага камітэта РКП(б) абласны камітэт стараўся ўплываць на ўсерасійскую палітыку» – вось прамовы адказных савецкіх і партыйных работнікаў (І.І. Рейнгольда і М.І. Калмановіча), якія прагучалі на IV абласной канферэнцыі (чэрвень 1918 г.) [17, ф. 59, воп. 1, спр. 56, л. 10 – 13].

Але заклікаючы Маскву да цэнтралізацыі Паўночна-Заходні абласны камітэт наўрад ці меркаваў, што яна будзе праходзіць за кошт звужэння яго кампетэнцыі. Справа ў тым, што цэнтральны ўрад не жадаў бачыць у Аблвыкамзахе аўтаномны савецкі ўрад. Асаблівае становішча Заходняй вобласці

заключалася ў тым, што значная яе частка была акупіравана германскімі войскамі. Аб'яднанне рэшткаў губерняў цэнтральная ўлада падтрымлівала, але разглядала Аблвыкамзах у якасці цэнтра, які выконвае функцыі губернскага [16, с. 134]. На ўсе аўтанамісцкія памкненні Аблвыкамзаха было накладзена вета. І 5 жніўня 1918 года, калі Аблвыкамзах прыняў пастанову аб неабходнасці стварэння Заходняй Камуны, у ёй абазначаецца статус будучага ўтварэння – адміністрацыйна-фінансавая адзінка РСФСР [17, ф. 59, воп. 1, спр. 44, л. 229].

Масква прыйшла да пераканання, што перашкодай і тормазам на шляху да цэнтралізацыі краіны з'яўляюцца абласныя аб'яднанні Саветаў. Але скасаваць ўкаранелыя абласныя апараты, якія набылі шырокія памеры і пры гэтым яшчэ супрацiўляліся, было не такой простай справай. Аб рашэнні скасаваць усе абласныя аб'яднанні было аб'яўлена А.Ф. Мяснікову (партыйны лідэр Заходняй вобласці) у пачатку лістапада 1918 года, падчас яго паездкі ў Маскву. Некаторым адказным работнікам вобласці (А.Ф. Мяснікову, С.В. Іванову, В.І. Яркіну) там была прапанавана праца. Імкненне цэнтра ліквідаваць вобласці выклікала абурэнне ў Паўночна-Заходнім абласным камітэце. Перавод у Маскву быў расцэнены там як тактычны крок: «цэнтр думае, што скасаваць вобласці здолее толькі тады, калі будуць забраны з месцаў кіруючыя таварышы» [17, ф. 59, воп. 1, спр. 11, л. 104].

Следуючы свайму курсу цэнтральны камітэт Камуністычнай партыі прыняў пастанову аб скасаванні абласных савецкіх аб'яднанняў. Каб падрыхтаваць глебу ў вачах грамадскасці, газета «Известия ВЦИК» змяшчае паведамленне, у якім гаварылася, што вобласці гэта часовая з'ява, якая выклікана толькі складанай абстаноўкай [12, с. 162]. У лістападзе 1918 года была створана адміністратыйная камісія, якая занялася падвядзеннем вынікаў дзейнасці абласцей. Старшынёй камісіі быў прызначаны Я.М. Свярдлоў. Ад Заходняй вобласці дэлегатам у яе быў накіраваны І.І. Рэйнгольд. Абласны камітэт рашуча «кінуўся» на абарону вобласці. На пасяджэнні 16 лістапада 1918 года было пастаноўлена зафіксаваць думку абласнога камітэта і афіцыйна перадаць яе ў ЦК, патрабаваць стварэнне другой камісіі (на парытэтных пачатках з прадстаўнікамі абласцей) звязацца з абласнымі камітэтамі другіх абласцей для сумеснага выступлення [17, ф. 59, воп. 1, спр. 56, л. 11 – 12].

Праца камісіі працякала бурна; прадстаўнікі абласцей адстойвалі іх права на існаванне; думкі раздзяліліся. Вынікам працы стала ліквідацыя Маскоўскай вобласці; функцыі па яе кіраўніцтву ўзяў на сябе непасрэдна СНК. Існаванне і развіццё астатніх абласцей было прызнана магчымым и пажаданым. У сваім заключным слове Я.М. Свярдлоў сказаў: «Зараз, калі Саветы ўмацаваліся, далейшае існаванне абласных аб'яднанняў стала залішнім. Але спяшацца з ліквідацыяй Уральскай, Заходняй і Паўночнай абласцей ня трэба, пакуль яны не зжылі самі сябе» [17, ф. 60, воп. 3, спр. 211, л. 62].

8 снежня 1918 года савецкі ўрад прыняў пастанову аб барацьбе з абласніцтвам і канцэлярскай цяганінай. У пастанове ўказвалася, што распараджэнні абласных мясцовых савецкіх устаноў, якія тармазяць дзейнасць цэнтральнай улады падлягаюць неадкладнай адмене. Абласныя і мясцовыя савецкія ўстановы абавязваліся выконваць дакладна і безагаворачна пастановы і распараджэнні цэнтральнай улады [22, с. 164 – 165]. 23 снежня 1918 года была прынята пастанова УЦВК аб абласных аб'яднаннях. Абласныя цэнтры, за выключэннем Маскоўскай вобласці, часова захоўваліся. Абласныя аб'яднанні павінны былі забяспечваць хуткае і няўхільнае правядзенне ў жыццё ўсіх загадаў цэнтральнай Савецакай улады. Ім адводзілася роля падначаленага цэнтру органа на месцах. Губерням давалася права свабоднага выхаду з абласных аб'яднанняў, цэнтральныя ўстановы маглі непасрэдна зносіцца з месцамі, мінуючы абласны цэнтры [22, с. 245]. Такім чынам, пакінуўшы часова вобласці, цэнтр тым не менш канчаткова пазбавіў іх аўтаномных праў і звёў да прамежкавых адміністрацыйных звёнаў.

Што тычыцца нацыянальнага характара аўтаноміі, то Заходняя вобласць адпавядала яму толькі адным момантам – нацыянальным складам. Паняцце савецкіх нацыянальна-дзяржаўных абласных утварэнняў у першыя гады Савецкай улады не мела дастаткова канкрэтнага азначэння. Іх змест некалькі канкрэтызаваўся ў звароце Народнага Камісарыята па справах нацыянальнасцей РСФСР у красавіку 1918 года да Саветаў Казані, Уфы, Арэнбурга, Екацерынбурга, Саўнаркама Туркестанскага краю і іншых. Там ўказвалася, што аўтаномія прадугледжвае арганізацыю ўсіх мясцовых органаў улады і кіраўніцтва, судовых і іншых органаў, забяспечвае ўжыванне роднай для працоўных мас краю мовы ва ўсіх сферах грамадска-палітычнага і культурнага жыцця. Як растлумачыў некалькі пазней Сталін, рэалізаваць права на нацыянальную аўтаномію – гэта «паставіць школу, суд, адміністрацыйныя органы на роднай мове» [3, с. 38]. Як можна ўзгадаць, справаводства, адукацыя ў Беларусі ў 1918 годзе, па традыцыі яшчэ дарэвалюцыйнага часу, вяліся на рускай мове, і за Аблвыкамзахам не назіралася ніякіх крокаў па беларусізацыі грамадска-палітычнага жыцця Заходняй вобласці. Наадварот, кіраўніцтва вобласці фактычна ігнаравала права беларускага народа на самавызначэнне.

Такім чынам з усяго вышэйсказанага можна зрабіць вывад, што Заходняя вобласць, як любая абласная адзінка, надзялялася рашэннямі III Усерасійскага з'езда Саветаў пэўнымі аўтаномнымі правамі,

аднак без юрыдычнага замацавання статусу. І ў дадзеным выпадку гаворка можа весціся аб вельмі абмежаваным варыянце аўтаноміі. Скарыстаць сваё аўтаномнае права Заходняй вобласці так і не ўдалося, але яе кіраўніцтва прадпрымала настойлівыя крокі па набыццю вобласці аўтаномнага статусу. Вынікі дадзенага даследавання сведчаць, што прыпісванне Заходняй вобласці статусу нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі не мае пад сабой рэальных гсітарычных падстаў.

Застаецца яшчэ адно цікавае пытанне: чаму ў савецкі час многія гісторыкі так настойліва імкнуліся надаць Заходняй вобласці статус нацыянальнай аўтаноміі? Таму, што на той момант ва ўмовах нямецкай акупацыі гэта магло б быць вырашэннем беларускага нацыянальнага пытання, што ў сваю чаргу сведчыла б аб паслядоўным ажыццяўленні Камуністычнай партыяй нацыянальнай ленінскай палітыкі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Каменская Н.В. Образование Белорусского Советского государства. – Мн.: Госиздат БССР, 1948. – 184 с.
2. Бугаёв Е.И. Возникновение большевистских организаций и образование Компартии Белоруссии. – М.: Госполитиздат, 1959. – 270 с.
3. Маргунский С.П., Кукреш Л.И. Интернациональное и национальное в государственном строительстве БССР (1917 – 1922). – Мн.: Наука и техника, 1978. – 164 с.
4. Куличенко М.И. Решение национального вопроса в искаженном свете буржуазной историографии // Вопросы истории КПСС. – 1966. – № 1. – С. 62 – 75
5. Горбунов Т.С. Изменение исторических судеб белорусского народа в результате Великой Октябрьской социалистической революции.– Мн.: Наука и техника, 1965. – 62 с.
6. Чистяков О.И. Взаимоотношения советских республик до образования СССР. – М.: Госюриздат, 1955. – 151 с.
7. Круталевич В.А. Рождение Белорусской Советской Республики. (На пути к провозглашению республики. Октябрь 1917 – декабрь 1918 г.). – Мн.: Наука и техника, 1975. – 336 с.
8. Хоміч С.М. Фарміраванне тэрыторыі Беларускай Савецкай Рэспублікі (канец 1918 – 1926): Дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02. – Мн., 2000. – 119 с.
9. Советский энциклопедический словарь / Гл. ред. А.М. Прохоров. – 4-еизд. – М.: Сов. энциклопедия, 1987. – 1600 с.
10. Мясников А.Ф. Избранные произведения. – Ереван: Айастан, 1965. – 708 с.
11. Собрание узаконений и распоряжений рабоче-крестьянского правительства. – 1917. – № 1.
12. Серебрякова З.Л. Областные объединения Советов России. – М.: Наука, 1977. – 230 с.
13. История Советской Конституции (в документах). 1917 – 1956. / Общ. ред. С.С. Студеникина. – М.: Госюриздат, 1957. – 731 с.
14. Серебрякова З.Л. Региональные Советы национальных районов. Март 1917 – март 1918 / Отв. ред. И.И. Минц. – М.: Наука, 1984. – 198 с.
15. Свердлов Я.М. Избранные произведения, статьи, речи, письма. – М.: Политиздат, 1976. – 410 с.
16. Гимпельсон Е.Г. Из истории строительства Советов (ноябрь 1917 – июль 1918). – М.: Госюриздат, 1958. – 179 с.
17. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 35, воп. 1, спр. 44. Ф. 59, воп. 1, спр. 11, 18, 56. Ф. 60, воп. 3, спр. 211, 368.
18. Дзяржаўны архіў Смаленскай вобласці. Ф. 161, воп. 1, спр. 29.
19. Сталин И.В. Сочинения. Т. 4. Ноябрь 1917 – 1920. – М.: Госполитиздат, 1947. – 480 с.
20. Ленин В.И. Полн. собр. соч. – изд. 5-е. Т. 36. март – июль 1918. – М.: Госиздат политической литературы, 1981. – 462 с.
21. Маргунский С.П. Создание и упрочение белорусской государственности (1917 – 1922 гг.). – Мн.: Изд-во Академии наук БССР, 1958. – 260 с.
22. Декреты Советской власти. Т. 4. 10 ноября 1918 – 31 марта 1919 гг. / Ред. комиссия Г.Д. Обичкин и др. – М.: Госполитиздат, 1968. – 731 с.